ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
31
ЖНІЎНЯ

№ 23 (1509)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

# 1 ВЕРАСНЯ — ДЗЕНЬ ВЕДАЎ! З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ, СЯБРЫ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ТЭЛЕТАЙП
•УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА•

## ВІНШУЕМ З ПЕРАМОГАЙ!

САКРАТАРЫЯТ ВЦСПС і сакратарыят ЦК ВЛКСМ падвялі вынікі Усесаюзнага агляду-конкурсу на лепшы рабочы і студэнцкі інтэрнат за 1985 год.

За поспехі, дасягнутыя ў паляпшэнні выхаваўчай, культурна-масавай, фізкультурна-аздараўленчай работы сярод працоўных і служачых, студэнтаў і навучэнцаў, якія пражываюць у інтэрнатах, стварэнні ім найбольш спрыяльных умоў быту і правядзення адпачынку, узнагароджаны па БССР дыпломам ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ ІНТЭРНАТ № 7 БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

## СЁННЯ

з 17.00. ва універсітэце пачынаецца святкаванне Дня ведаў. У праграме свята выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці, парад атракцыёнаў, дзе, напрыклад, будзе працаваць часовае фотаатэлье для жадаючых у гэты дзень сфатаграфавацца на памяць. Увечары — дыскатэка.

На свята запрашаюцца ўсе жадаючыя. У першую чаргу, новае папаўненне студэнцкай сям'і — учарашнія абітурыенты. Чакаем вас!

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

## ПРАГНАЗІРУЕ... ПРЫБОР

Унікальнай уласцівасцю — аглядаць палі, апаратыўна выяўляць прыкметы развіцця раслін і іх захворванні, звязаныя са змяненнямі пігментнага апарата, надзелена сістэма, распрацаваная супрацоўнікамі НДІ прыкладных фізічных праблем Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Звычайныя метады візуальнага агляду сельскагаспадарчых угоддзяў, якія спалучаюцца з лабараторным аналізам асобных проб, вельмі працаёмкія. Таму рашэнні па лячэнню або перасеву ў гаспадарках нярэдка прымаюцца са спазненнямі. Галоўная вартасць вынайдзенага «электроннага агранома» — у дакладнасці: па паказаннях прыбора можна вызначаць, напрыклад, гушчыню пасеваў азімых, стадыю росту культур, патрэбнасць іх ва ўгнаеннях, нават аб'ектыўна ацэньваць, у якой ступені паражона поле пустазеллем.

(БЕЛТА)

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР НАЙБОЛЬШ ВЫЗНАЧЫЎШЫХСЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ І АРГАНІЗАТАРАЎ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

Прыгодзіча Мікалая Рыгоравіча — старшага выкладчыка Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»:

Вярэнчыкава Ігара Рамановіча — студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Шарашкіну Іраіду Васільеўну — студэнтку Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»:

Крыштана Ігара Іванавіча — студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Панчанка Людмілу Васільеўну — студэнтку Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
А. ГРАМЫКА.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Т. МЕНТЭШАШВІЛІ.

Масква, Крэмль.
31 ліпеня 1986 г.

ЖАДАЕМ ВАМ...

## БУДЗЬЦЕ ВЫШЭЙ СТОМЛЕНАСЦІ!

ВОСЬ ВЫ і сталі студэнтамі. Калі збываюцца мары, то адчуваеш сябе самым шчаслівым чалавекам на свеце. Але з'яўляюцца новыя планы, новыя справы. Наперадзе ў вас цікавая, але цяжкая дарога ў пяць год. Якімі стануць гэтыя гады, залежыць ад вас: гадамі, насычанымі цікавымі і патрэбнымі справамі, ці проста растрачаным часам. Для факультэта, для кожнага выкладчыка вельмі важна, якімі спецыялістамі, людзьмі стануць іх вучні. Зразумела, што гэта павінен быць добры спецыяліст, дастойны, сумленны чалавек, гатовы служыць сваёй справе, людзям, Радзіме.

Падрыхтоўка добрага спецыяліста, які адпавядае сучасным патрабаванням, гэта, перш за ўсё, вялікая праца выкладчыка, студэнта. Студэнт павінен хацець і ўмець вучыцца. Неабходна працаваць з першых дзён вучобы напружана. Павольны тэмп расслабляе. Бывае так, што першакурснікі не ўключаюцца ў вучобу з першых дзён («пачну потым», «пачну заўтра»...), а некаторыя, адстаўшы безнадзейна, губляюць веру ў сябе, губляюць цікавасць да выбранай спецыяльнасці, застаюцца хранічна адстаючымі. Вядома, што не атрымаецца з такога студэнта выдатнага спецыяліста. А рыхтаваць пасрэдных спецыялістаў у наш час, які патрабуе рашэння складаных задач, нерэнтабельна і недапушчальна.

Навучыцеся планаваць свой час, пачынаючы з першага курса. Асабліва звярніце ўвагу на патрабавальнасць да саміх сябе. Дарагія першакурснікі, хацелася б, каб вы былі ўважлівымі адзін да аднаго, каб адгукаліся на добрыя справы, умелі сябраваць, ведалі цану сапраўднай дружбе. Хочацца бачыць вас зацікаўленымі людзьмі, бо іменна зацікаўленасць дае магчымасць дасягнуць не толькі добрых вынікаў у вучобе, але і стаць неардынарнай асобай. Хочацца, каб вы навучыліся і маглі быць вышэй стомленасці, якая выпадае на долю нялёгкага жыцця першакурснікаў, каб спешка, якая імітуе жыццёвую актыўнасць, не замяніла сэнсу жыцця і работы.

Навучыцеся рабіць адкрыцці для сябе, якія расшыраюць межы духоўнага свету, даюць магчымасць бачыць у будзённым нечаканае і незвычайнае. Поспехаў вам!

Л. КАХНОВІЧ,
загадчыца кафедры фізіялогіі раслін біялагічнага факультэта, дацэнт.



ЁСЦЬ ПЯЦЁРКА!

ЖАДАЕМ ВАМ...

## Чакаем ініцыятывы!

ВАМ, ЛЮДЗЯМ, на плечы якіх кладзецца асноўны абавязак і асноўная адказнасць па ажыццяўленню рашэнняў XXVII з'езда партыі, вам, ад поспехаў і працы якіх залежыць будучыня нашай Радзімы і лёс кожнага з нас, я перадаю сардэчнае прывітанне ад пакалення, якое ўзяло на свае плечы цяжкасць прайшоўшай вайны і цяжар пасляваеннага ўзнаўлення. Наша пакаленне зрабіла сваю справу. Чарга за вамі, за тымі, хто крочыць у будучае тысячагоддзе поўнымі сіл і творчага пошуку.

Вы такія маладыя цяпер, і кожны, вядома, выбірае па сабе надзеі, імкненні, кожны будуе свае планы на будучыню, жадаючы заняць дастойнае месца ў гэтым будучым. Я хачу, каб вы былі дастойны нашага універсітэта, лепшага ў нашай краіне. Вы павінны быць працалюбівымі, сумленнымі, настойлівымі і рашучымі той ініцыятывай, якая дазваляе чалавеку праявіць сябе. Бясспрэчна, што сярод вас, прыйшоўшых у БДУ сёлета, ёсць будучыя кіраўнікі буйных прадпрыемстваў, партыйныя і савецкія работнікі, прафесары і акадэмікі, умельцы — залатыя рукі і маці-гераіні.

Адкрывайце свае здольнасці, старайцеся быць добрымі студэнтамі.

Праз 16 год, у 2002 годзе будзе васьмідзесяцігадовы юбілей універсітэта. Знайдзіце час, папрысутнічайце на гэтым свяце, успомніце вашы сённяшнія планы і надзеі. Шчасця вам, маладыя!

А. ШЫРОКАЎ,
дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі, прафесар.

РЭПАРТАЖ З УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ

# ПАЧАТАК













*МІНУТА, другая, роздум, ціішыня... А што суседзі, як яны рыхтуюцца да свайго першага экзамена? Павярні галаву — і ты ўбачыш такія ж засяроджаныя твары.*

*Мінута, другая... Час імчыць, ляціць хуткакрылай птушкай, і ты ведаеш: яго не спыніць, не адмяніць заўтра і тое, што адбудзецца праз некалькі хвілін.*

*Уступны экзамен... Момант, калі чалавек павінен паказаць усяго сябе, усе свае веды. Як падлічыць, колькі нерваў, энергіі траціцца за той час, пакуль ён рыхтуецца да адказу? Як наогул лепш падрыхтавацца? Як пабудаваць свой адказ?*

*Гэтыя і іншыя пытанні для цябе, паважаны першакурснік, ужо вырашаны. Ты змог зацікавіць экзаменатара эрудыцыяй, паказаць свае веды, ты знайшоў у сабе сілы, каб пераадолець хваляванні і баязлівасць. Ты перамог, першакурснік, і цяпер глядзіш на гэтыя здымкі як на нешта мінулае, пройдзенае. Але ведай — гэта толькі пачатак, усё студэнцкае жыццё яшчэ наперадзе, і будзе яшчэ многа-многа экзаменаў, залікаў. Будзе яшчэ галоўны экзамен — на жыццёвую сталасць.*

*Мацуйся!*

*Тэкст і фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

*НА ЗДЫМКАХ: імгненні ўступных экзаменаў; на экзамене прысутнічаюць міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. МЯШКОЎ і рэктар універсітэта Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ.*

ЭКСКУРСІЯ ПА УНІВЕРСІТЭТУ

# ГЭТА І ВАШ ДОМ

**Прывітанне, дружа-першакурснік! Вось і збылася твая мара — ты паступіў у БДУ. Прымі мае віншаванні. Эх, як я табе зайздрошчу! Колькі новага, цікавага, нязведанага ў цябе наперадзе! Можа хто і скажа: «Вось дзівак-чалавек! Дайшла да 4 курса і зайздросціць таму, у каго ў залікоўцы няма ніводнага запісу». Таму і зайздрошчу, што няма запісаў пра здадзеныя залікі і экзамены. Таму і зайздрошчу, што першая студэнцкая «бульба», першы будатрад, першае даручэнне групы ці курса — усё яшчэ ў цябе будзе. А пакуль — маю прапанову: давай papадарожнічаем па нашаму універсітэту. Табе цяжка арыентавацца на новым месцы. Паспрабую дапамагчы. Пачнем?**

ЗБІРАЕМСЯ каля галоўнага корпуса, што знаходзіцца на Ленінскім праспекце. Ты тут бываў, калі здаваў уступныя экзамены. Ці ўсе сабраліся? Студэнты факультэта прыкладной матэматыкі, механіка-матэматычнага, гістарычнага і фізічнага, якія будуць займацца ў галоўным і фізічным карпусах, ужо на месцы. З вуліцы Свярдлова прыйшлі будучыя журналісты, а з Чырвонаармейскай — філолагі. Зусім побач ва універсітэцкім гарадку размешчаны геаграфічны і хімічны факультэты. А вось дабраліся прадстаўнікі самых дальніх факультэтаў — радыёфізікі і біёлагі, якія жывуць і вучацца на вуліцы Курчатава. Яны захапілі з сабой з вуліцы Маскоўскай студэнтаў юрфака і аддзялення міжнароднай журналістыкі. Вось цяпер усе.

Вы, паважаныя першакурснікі, гаспадары універсітэта. А гаспадар заўсёды павінен ведаць сваю гаспадарку. Перш за ўсё, вядома, свой факультэт. Там вы з дапамогай старшакурснікаў ці самі адшукаеце дэканат, камітэт камсамола, прафком. У дзверы з такімі шыльдачкамі за пяць год вучобы вам давядзецца неаднаразова заходзіць. На самым відным месцы вы знойдзеце расклад заняткаў. Не пужайцеся яго, бо ён не такі заблытаны, калі ведаеш, што кожны прадмет працягваецца «пару» — дзве гадзіны з перапынкам паміж імі ў 5 хвілін. А паміж «парамі» вы маеце 10 хвілін на адпачынак. Май на ўвазе, першакурснік, што спазняцца на заняткі дрэнна і непрыгожа. І адразу навучыся пісаць канспект: адбірай галоўнае, выдзяляй асноўны кірунак думкі выкладчыка. Канспект дапаможа і на семінарах, і на практычных, і, вядома, пры здачы сесіі (ты ж ведаеш, што здаваць залікі і экзамены табе давядзецца два разы ў год — зімой і летам).

Памятаеш пра дзверы з надпісамі «Дэканат», «Камітэт камсамола», «Прафсаюзны камітэт»? Калі ласка, заходзь! Ад цябе, дружа-першакурснік, твой факультэт чакае цікавых спраў, прапаноў. Калі ў цябе нешта не будзе ладзіцца, прыходзь у дэканат, камітэт камсамола — там пастараюцца дапамагчы.

Запомніце, што галоўны корпус — гэта месца скрыжавання ўсіх сцежак-дарожак нашага універсітэцкага гарадка. Тут на другім паверсе знаходзіцца рэктарат і партком, а на трэцім — камітэт камсамола і прафсаюзны камітэт. Ці заўважылі вы, паважаныя першакурснікі, шыльдачкі «Бібліятэка»? Калі вам спатрэбіцца мастацкая літаратура ці даведка аб нейкай кнізе, то ідзіце на другі паверх, дзе размешчаны абанемент мастацкай літаратуры і даведачная картатэка. Калі ж ты захочаш атрымаць падручнік ці пазаймацца ў чытальнай зале, тады падыміся паверхам вышэй. Адразу папярэджваю: здавай кнігі своечасова, бо яны патрэбны і іншым студэнтам.

Ногі яшчэ не баляць? Трэба займацца спортам. Дарэчы, кафедра фізічнага выхавання знаходзіцца на 4 паверсе. Запішыцеся абавязкова ў спартыўныя секцыі. Па жаданню можна выбраць валейбол ці баскетбол, футбол ці вольную барацьбу...

А вось яшчэ адзін факультэт БДУ — факультэт грамадскіх прафесій (ФГП). На ім за час вучобы вы зможаце набыць яшчэ адну прафесію. Выбірай аддзяленне ФГП і займайся: школа маладога лектара, школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы, гурток бальных танцаў, аддзяленне фотакарэспандэнтаў і іншыя. Самае галоўнае — вызначыць тое, што цябе цікавіць, што б яшчэ хацеў умець рабіць, акрамя асноўнай спецыяльнасці.

Ці не час паабедаць? Тады спускаемся ўніз: у цокальным паверсе галоўнага корпуса ёсць сталовая. Можна смачна падсілкавацца на журфаку ці хімфаку. Да тваіх паслуг два буфеты, якія размешчаны на фізічным факультэце і ў памяшканні бухгалтэрыі.

А цяпер выйдзем на вуліцу Бабруйскую. Тут размешчана універсітэцкая паліклініка. Калі захварэеш, то прыходзь да свайго факультэцкага ўрача. Калі ж табе неабходна будзе кансультацыя спецыялістаў той ці іншай галіны медыцыны, то накіроўвайся ў 33 міжвузаўскую паліклініку.

Вось і падышла к канцу наша экскурсія. Цяпер — дамоў. Твой другі дом — студэнцкі інтэрнат. Значыць, цябе можна знайсці ў інтэрнаце № 1 на вуліцы Свярдлова або ў інтэрнатах № 2, 5, 6, 7 на Кастрычніцкай ці на праспекце Машэрава ў інтэрнаце № 4 або на вуліцы Курчатава, дзе знаходзіцца інтэрнат № 3. Пражыванне ў інтэрнаце каштуе 10—13 рублёў за семестр. Калі ж ты не атрымаў пакоя ў інтэрнаце, ідзі ў прафком універсітэта, там табе прапануюць адрасы, дзе здаюцца кватэры.

Перад тым, як развітацца, хачу табе, дружа-першакурснік, і тваім сябрам паказаць яшчэ адзін будынак на вуліцы Бабруйскай. Вось тут знаходзіцца ў пакоях № 72 і 73 рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт». Падпісацца на яе ты зможаш на сваім факультэце ў кастрычніку. Заходзь да нас, калі ласка. Прынось свае допісы, вершы, апавяданні. Да новых сустрэч, таварышы першакурснікі! Цяпер БДУ — ваш дом. Будзьце ў ім добрымі і дбайнымі гаспадарамі!

С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

## АБІТУРЫЕНТ — СТУДЭНТ

# «ПА-СТУ-ПІЎ!»

**Хто з вас, паважаныя чытачы, памятае тыя першыя дзверы, за якімі пачалося цікавае падарожжа ў самую лепшую краіну пад назвай «Студэнцтва»? Гэта самыя шырокія, самыя гасцінныя дзверы, якія я ведаю ва універсітэце. Магу іх параўнаць з уваходам у прывакзальны будынак, дзе на першым пуцi фарміруецца штолета новы, вельмі вялікі цягнік «Абітурыент — студэнт — спецыяліст». І якім бы вялікім ён ні здаваўся, колькасць месц у ім строга абмежавана, і колькі б жадаючых ні з'явілася на перон, паедуць толькі самыя дастойныя. А каб не было ніякіх памылак, напярэдадні адпраўкі аб'яўляюцца доўгія спісы з прозвішчамі тых, для каго краіна Студэнцтва адчыніла свае дзверы.**

Ці ўспомнілі гэтыя дзверы? Самыя шчырыя, самыя ветлівыя? Так, у час уступных экзаменаў яны адчынены для ўсіх жадаючых. І цяпер, калі экзамены ўжо скончыліся і засталося некалькі дзён да пачатку навучальнага года, яны распахваюцца ад раніцы да вечара. Бо ў спісах «Абітурыентаў, якія сталі студэнтамі» (так яны называюцца) заключаецца вялікая прыцягальная сіла.

— Сяброўкі, ці можна вас павіншаваць?

— Ой, не ведаем!

З гутаркі даведваюся, што Іра Цахановіч гісторыю любіць даўно. Захапілася марай аб настаўніцтве. Пазней яе настаўнікі падказалі звярнуць увагу на гісторыю. Яны так і казалі: «З цябе, Іра, можа атрымацца нядрэнны выкладчык гісторыі, паслухай нас!». І дзяўчына паслухала. Таццяна Гірыс таксама гаварыла аб сваёй любві да гісторыі. Хацела б пасля заканчэння універсітэта займацца археалогіяй. Але калі не атрымаецца, з задавальненнем стала б выкладчыцай. Цікава, што абедзве дзяўчыны пасля заканчэння былі б не проста згодны, а вельмі б жадалі вярнуцца дамоў. Аднак якія ў іх шансы апынуцца ў радах студэнтаў? Вядома, што конкурс на гістарычны быў вялікі. Але Таццяна трымаецца ўпэўнена: яна — медалістка, па прафгутарцы атрымала 2 балы. Іра здавала ўсе экзамены, набрала 15 балаў, хвалюецца. «Але ўсё роўна,— гаворыць яна,— гісторыкам буду!». На пытанне, чаму дзяўчаты ідуць за дыпломам іменна ва універсітэт — дыплом выкладчыка гісторыі можна атрымаць і ў іншых ВНУ,— яны адказалі, што «БДУ — гэта не толькі вельмі прэстыжна і справа не толькі ў дыпломе. Мы думаем, што універсітэт дае веды больш грунтоўныя. А нам гэта і патрэбна». На развітанне я пажадала ім як добрым сяброўкам разам паступіць і добра вучыцца. А яны заўсміхаліся: «Мы толькі сёння пазнаёміліся!».

А вось таварыш, які беспамылкова паступіў — у яго самы шчаслівы твар!

Эдуард Урублеўскі, учарашні абітурыент факультэта радыёфізікі і электронікі:

— Якія мае ўражанні ад абітурыенцкага перыяду жыцця, пытаеце? Якія там уражанні! Ці можна іх зараз параўнаць з такой радасцю — па-сту-піў!

Захапленне фізікай у Эдуарда пачалося з першага ўрока ў школе. Захапленне аказалася шчаслівым, бо гарэць яму яшчэ доўгія гады. Нішто не перашкаджае, бо Эдуард — «па-сту-піў!».

Аксана Басалаеўская так спакойна адказвае на маё аднолькавае для ўсіх пытанне, што міжволі здзіўляешся: «І гэта цябе не хвалюе?!».

— А чаго хвалявацца? Я ўжо ведала, што паступіла. Бо ішла па эксперыменту, здавала толькі матэматыку: пісьмова і вусна. З матэматыкай у мяне добра: скончыла спецшколу № 50 г. Мінска. Узровень уступных ўяўляла.

— Усё ж прабач, Аксана, але здаецца, ты нечым незадаволена?

— Хісталася я паміж матэматыкай і архітэктурай. Але мне паступіць на «архітэктуру» складаней. Ды і мама-матэматык «паднаціснула». А думкі ўсё роўна да архітэктуры ляцяць!

— Як уяўляеш сябе ў будучым?

— Нармальна. Праграмістам. З ЭВМ на «ты».

Невясёлая сёння Іна Марчанка. А чаго радавацца? Камісія, якая нядаўна прымала яе дакументы, сёння вяртае іх назад.

— Іна, не адчайвайся! Паступіш у другі раз!

— Не, я не адчайваюся...

— Маленькі! А ты што тут робіш? Таксама паступаеш?

— Не. Я яшчэ падрасці павінен, мне толькі 11 год. За брата Сашу хвалююся.

— А ён жа дзе?

— За вуглом. Баіцца. Я і на экзамены яго вадзіў.

Вось дык брат Саша!

Дзмітрый Сяргееў залічаны на факультэт прыкладной матэматыкі. Адчувае сябе упэўнена і добра. Але сказаў, што паступленне для яго не навіна № 1. Дзіма ўжо даўно ведаў, што ён паступіць. Добра скончыў спецшколу № 19 г. Мінска. Мама напярэдадні экзаменаў усё паўтарала: «Вучы, вучы!». Бацька маўчаў — у сыне не сумняваўся. І правільна — здаваў Дзіма па эксперыменту. Можна да Дзіміных слоў дадаць, што ён — абітурыент, для якога фінішная прамая далася лёгка, без задышкі.

Сяргей Шылаў паступаў на гістарычны факультэт, аддзяленне філасофіі. Таксама пры паступленні за сябе хваляваўся мала.

Што вызначыла яго выбар?

— Вялікае дзякуй майму настаўніку гісторыі і грамадазнаўства А. Падабеду, які не шкадаваў на мяне свайго часу і ўвагі.

— Сяргей, ты яшчэ добра памятаеш выпускныя экзамены. Параўнай іх з універсітэцкімі.

— Магу толькі на прыкладзе грамадазнаўства. У школе выкладчыкі ведалі мой узровень і таму маглі мяне падкалупнуць складаным пытаннем. А ва універсітэце я адчуў аб'ектыўныя адносіны да экзаменуемых: пытанні да ўсіх гучаць аднолькава. Магу нават сказаць, што ўступны экзамен быў лягчэйшы.

— А родным тваім зараз за цябе радасна?

— Так. Яны задаволены, хаця не ўсе яшчэ блізкія ведаюць, што я паступаў у БДУ і ці паступіў.

«А была б мая воля, я б арганізавала тут часовы міжгародны тэлефонны пункт ці тэлеграф,— падумалася мне,— настолькі важная гэтая вялікая радасць: «Па-сту-піў!». Бо яна звязана са шчаслівай краінай Студэнцтва.

**А. ВІХРОВА,**
наш кар.

## АБІТУРЫЕНЦКІ МАРАФОН: УДЗЕЛЬНІКІ І БАЛЕЛЬШЧЫКІ









## ПАМЯЦЬ

# ДЗЯДУЛЕВЫ ДЗЁННІКІ

**НАПЭЎНА, у кожнай сям'і ёсць рэліквіі гераічных і суровых дзён нашага слаўнага мінулага. Ордэны, асабістыя рэчы бацькоў і дзядоў, пажоўклыя ад часу здымкі захоўваюцца беражліва як памяць для будучых пакаленняў.**

**Пра свайго дзеда — генерал-лейтэнанта Дзмітрыя Цімафеевіча Казлова я чуў шмат ад бабулі і мамы. Яго рэчы, ордэны захоўваюцца ў Андзіжанскім і Неманганскім краязнаўчых музеях, у Чарнігаўскім дзяржаўным музеі імя Шчорса. Усё сваё жыццё ён прысвяціў абароне Радзімы: ваяваў у грамадзянскую, біў басмачоў, камандаваў фронтам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Добрую памяць захавалі пра яго людзі. І цяпер, пасля яго смерці, да нас ідуць пісьмы з просьбамі расказаць пра генерала Казлова.**

**Так, шкада, што я не бачыў свайго дзеда, не чуў яго расказаў. Але я перачытваю зноў і зноў яго дзённікі. І спрабую ўявіць карціны паходаў, бітваў, мімалётных мінут адпачынку, апісаныя па-салдацку скупымі, але такімі ёмістымі словамі.**

**У ліпені 1920 года Туркестанкі стралковы полк, якім камандаваў мой дзед, удзельнічаў у падаўленні мяцяжу ў горадзе Верным (цяпер Алма-Ата). У канцы жніўня быў атрыманы загад ад камандуючага Туркестанскім фронтам М. В. Фрунзе: дывізію, у састаў якой уваходзіў яго полк, перакінуць у Ферганскую даліну для барацьбы з басмачамі.**

**Да станцыі Бурнае дывізія рухалася фарсіраваным маршам. Каля 700 кіламетраў полк прайшоў на працягу трох тыдняў. Ішлі хутка, даючы сабе адпачынак і сон па 3—4 гадзіны. За ўвесь час пераходу не было ніводнага дажджу — стаяла нясцерпная гарачыня, людзі падалі з ног ад сонечных удараў. Паселішчы стаялі адно ад другога на дзесяткі кіламетраў, не хапала вады, рэгулярнага забеспячэння харчаваннем не было. Аслабеўшых і сцёршых ногі байцоў везлі на падводах, але іх таксама не хапала.**

**Нарэшце — доўгачаканая станцыя Бурнае... Потым поездам да Ташкента. У дарозе пачулі вестку: сам легендарны Фрунзе будзе рабіць агляд.**

**«Выстраіў я полк на ўскраіне горада,— чытаю ў дзядулевым дзённіку. — Трымаліся чырвонаармейцы бадзёра, малайцавата, праўда, уражвала стракатасць абмундзіравання. Не было адзінай формы, адзінай зброі. Аркестр зайграў сустрэчны марш, а потым «Інтэрнацыянал».**

**Да строю пад'ехаў Фрунзе і вітаў полк. Нягледзячы на тое, што ўсе былі стомлены цяжкім пераходам, у адказ прагрымела стройнае трохразовае «ўра» — перад байцамі ж быў іх вядомы камфронта, і гэта надало новыя сілы.**

**М. В. Фрунзе больш гадзіны аглядаў полк:**

**— Адкуль прыбыў, браток?**

**— З Тулы,— адказаў малады рабочы.**

**— А ты?**

**— Горны арол, таварыш камандуючы. — Так называлі сямірэчанскіх партызан, якія ваявалі супраць Калчака ў гарах Таргабатая. Некаторых чырвонаармейцаў Міхаіл Васільевіч распытваў аб сям'і, аб гаспадарцы: ведаў, што многія сумавалі па дому, па пакінутай працы. Затрымаўся каля былых калчакаўцаў — і такія, добраахвотна перайшоўшыя ў Чырвоную Армію, былі ў страі. Потым слухаў скаргі, а даручэнец запісваў іх у блакнот. Многія скардзіліся на дрэннае абмундзіраванне і трафейную зброю — у палку яна была 3—4 відаў. Патрэбны былі розныя патроны, а іх у той час не хапала.**

**Пасля агляду адбыўся мітынг. Выступаючы, Фрунзе падзякаваў чырвонаармейцам і камандзірам за ўдзел у падаўленні белагвардзейскага мяцяжу ў горадзе Верным. Ён не хаваў тых цяжкасцей, праз якія давядзецца прайсці палку. Завяршаючымі словамі былі: «Ідзіце ж туды, у раён Каканда — вы павінны закончыць разгром контррэвалюцыі!».**

**На другі дзень полк атрымаў зброю, боепрыпасы, палявыя кухні і абмундзіраванне. Пра яго варта сказаць асобна. Гэта была форма туркестанскіх стралкоў царскай арміі: белыя гімнасцёркі, суконныя малінавыя штаны і баваўняны галаўны ўбор, які ахоўваў ад цеплавых удараў. Жартам яго называлі «дзень добры і бывай» напэўна таму, што наперадзе і ззаду быў казырок. Да вечара полк пагрузіўся ў эшалоны.**

**Пасля гэтай памятнай сустрэчы мінула крыху больш як пяць гадоў. Пахмурным кастрычніцкім днём 1925 года прыйшло горкае паведамленне: памёр Міхаіл Васільевіч Фрунзе. Разам з іншымі слухачамі Ваеннай акадэміі дзядуля развітваўся з ім у Калоннай зале Дома Саюзаў, а потым праводзіў у апошні шлях да Крамлёўскай сцяны. Дзядуля да самай смерці ўспамінаў выдатнага палкаводца, чалавека вялікай душы — М. В. Фрунзе.**

**Старонку за старонкай перагортваю я франтавыя дзённікі генерала Казлова. Сухія заметкі аб баях, аб ваенных аперацыях. Часцей за ўсё сустракаюцца імёны і прозвішчы малодшых камандзіраў і салдат, паплечнікаў па службе.**

**Але вось маю ўвагу прыцягнуў запіс: «Рэвальвер № 108290. Міністр замежных спраў Калчака барон фон Бутберг».**

**...У трывожным кастрычніку 1919 года Д. Ц. Казлоў быў прызначаны камандзірам палка, які ўваходзіў у састаў Пятай арміі Тухачэўскага. Яна вызваляла Сібір ад войск Калчака. Увесь кастрычнік полк з баямі рухаўся на Омск. Пачаліся сібірскія халады, лютаваў сыпны тыф.**

**На вялікіх прывалах пакідалі хворых, мёртвых, абмарожаных. Па дарозе ў Сергіопаль з ходу ўзялі паштовую станцыю Аягузскую. Загадана было зняць чырвоныя стужкі на шапках і банты на грудзях, якія азначалі прыналежнасць да Чырвонай Арміі, — знаходзіліся ў глыбокім тыле дутаўскіх войск.**

**У Аягузскім полк спыніўся на начлег, выставіўшы вартавую ахову на заставе ў бок Сергіопаля. Ноччу да пікета пад'ехала багатая тройка. Не прадставіўшыся, начальнік заставы суправадзіў прыбыўшых у штаб палка, які знаходзіўся ў саманным доміку. Частка штабістаў ужо спала. Пакой асвятляўся газавай лямпай без шкла. За сталом начальнік гаспадарчай часці складаў ведамасць на харчаванне, побач сядзеў Д. Ц. Казлоў.**

**Дзверы расчыніліся і ўвайшлі прыехаўшыя. Толькі тут яны пачалі здагадвацца, куды трапілі.**

**— Вашы дакументы? — спыталі ў іх.**

**Адзін з увайшоўшых, мяркуючы па ўсяму, старэйшы, ходарлявы мужчына сярэдніх гадоў з бездакорнымі манерамі дастаў пасведчанне.**

**— Прозвішча? — спытаў Казлоў, уважліва вывучаючы дакументы.**

**— Барон фон Бутберг, а гэта мой ад'ютант, паручнік Мішукоў.**

**Прапанавалі здаць зброю. Выцягваючы з кішэні англійскага фрэнча маленькі рэвальвер, барон працадзіў:**

**— Што вы робіце! Расіі служу...**

**— Не Расіі, а сусветнай контры...**

**У санях знайшлі некалькі чамаданаў з рэчамі і пісьмамі Калчака ў Англію, Амерыку і Японію. Шмат было таксама калчакаўскіх грошай, аплату якіх гарантавалі ў золаце іх саюзнікі. Бутберг паводзіў сябе высакамерна і нахабна, але паступова, ратуючы сваё жыццё, памякчэў. Ён расказваў, што ехаў у стаўку атамана Дутава, падрабязна выклаў планы Калчака. Раніцай, у суправаджэнні аховы, барон быў адпраўлены ў штаб дывізіі, а праз некалькі дзён яго дапытваў камандарм Тухачэўскі.**

**Як падзяку за затрымку сакрэтнай калчакаўскай перапіскі з Антантай, апублікаванне якой мела вялікае значэнне для маладой рэспублікі, Тухачэўскі прыслаў дзеду маленькі рэвальвер пад нумарам 108290, той самы, які быў адабраны ў фон Бутберга на Аягузскім пікеце.**

**Шмат цікавых сустрэч і падзей было на доўгім вяку дзеда. У чэрвені 1918 года ён добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі і прайшоў у ёй шлях ад малодшага камандзіра да генерал-лейтэнанта. У час Вялікай Айчыннай вайны займаў пасады аж да камандуючага фронтам, быў прадстаўніком Стаўкі ў гераічным Ленінградзе.**

**Я ЗНОЎ І ЗНОЎ перачытваю яго дзённік, старыя газеты, распытваю родных. Мне дарагая кожная падрабязнасць жыцця майго дзеда — савецкага генерала Дзмітрыя Цімафеевіча Казлова. Яго лёс дапамагае мне лепш зразумець лёс сваёй краіны, нараджае жаданне не прайсці бясследна па жыцці.**

**Д. КІРЫЛАЎ,**
**студэнт БДУ**
**імя У. І. Леніна.**

ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ

# «Выбіраю бязвыплатную працу...»

СЦВЯРДЖАЮ: юнакі і дзяўчаты з атрадаў бязвыплатнай працы — народ асаблівай кагорты. Пераканана ў гэтым. І давайце адразу адмяжуемся ад розных «але» накшталт: «Часам прыналежнасць да такога ЛСА — як візітная картка да прыязных адносін з дэканатам і стыпендыяльнай камісіяй...» Не імі моцныя студэнцкія атрады бязвыплатнай працы — сапраўднымі энтузіястамі. Іменна яны — залаты фонд нашага будатрадаўскага руху. Сёння, напрыклад, ужо немагчыма ўявіць ЛСА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна без дзяўчат, якія з году ў год два свае канікулярныя месяцы працуюць у дзіцячым доме № 2 г. Мінска. Усе заробленыя грошы студэнткі расходуюць на падарункі дзятве: сукенкі і калготкі, кашулі і шорцікі, алоўкі і альбомы для малявання. Толькі той, хто хоць аднойчы шчыра прысвяціў свой працоўны семестр хлопчыкам і дзяўчынкам, якія растуць без бацькоў, мае рацыю сказаць, што ён ведае клопаты і радасці студэнцкага атрада імя 3 ліпеня.

А першы ў рэспубліцы атрад бязвыплатнай працы імя Аляксандра Матросава будаваў мемарыяльны комплекс на месцы подзвігу воіна-камсамольца. Гэта быў атрад БДУ імя У. І. Леніна.

Бескарыслівая праца студэнцтва — характэрная рыса летняга семестра. І таму важнай і цікавай мне ўяўляецца шчырае абмеркаванне матываў удзелу студэнтаў у атрадах бязвыплатнай працы. Давайце разам падумаем. І на першае месца вылучацца: жаданне прынесці карысць грамадству, самазацвярджэнне ў працэсе працы.

Выдатная і добрая вучоба — таксама абавязковая ўмова для прыёму ў атрад, асноўны паказчык добрасумленных адносін да працы. Але галоўнае — прыхільнасць ідэі атрада, бескарыслівасць пабуджэнняў. Вы згодны са мной?

Атрады бязвыплатнай працы рашаюць сур'ёзныя, важныя задачы грамадскага развіцця. Але, бадай, найбольш значная з іх — задача выхавання моладзі. Добраахвотная, высокая маральна-палітычная мэта, якая служыць асновай усёй дзейнасці такіх атрадаў, валодае асаблівым выхаваўчым уплывам на іх удзельнікаў.

У большасці байцоў удзел у АБП пакідае незабыўнае ўражанне, памяць на ўсё жыццё.

І таму вельмі важна, каб такія атрады нараджаліся не проста на ідэі бязвыплатнай працы, а на ідэі бязвыплатнай працы на карысць высакародных мэт. Канкрэтная мэта ў многім вызначае характар атрада. Удзел у АБП прымушае задумацца над правільнымі суадносінамі матэрыяльнага і маральнага (хоць зразумела, што матэрыяльны фактар адыгрывае не апошнюю ролю ў жыцці студэнта). Як мы развіваем актыўнасць студэнцтва? Ці не перабольшваем у ацэнцы выключнасці такіх атрадаў бязвыплатнай працы? Ці не дапускаем непатрэбнай кампанейшчыны ў штучным распаўсюджванні гэтых прынцыпаў на ўсе калектывы?

Мяркую, наўрад ці апраўдана ўсе атрады, якія пералічваюць частку сваёй зарплаты на розныя грамадска-карысныя мэты, называць камуністычнымі, або атрадамі камуністычнай працы. Справа, вядома, не ў словах. Важная перш за ўсё сутнасць.

Нам яшчэ трэба сур'ёзна падумаць і над тым, па якіх крытэрыях ацэньваць работу байцоў АБП, як улічваць спецыфіку атрадаў пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў рамках навучальнай установы. Сёння, на жаль, часта бывае, што па лічбах асвоеных капіталаўкладанняў АБП стаяць ледзь ці не ў самым «хвасце» спаборнічаючых. Ніхто не аспрэчвае: варты пашаны байцы студатрадаў, якія за працоўны семестр умеюць пабудаваць цэлыя вуліцы. А дзяўчаты, якія даглядаюць цяжкахворых у бальніцах, якія расказваюць малым казкі, прышываюць гузікі на кашулькі, а ў «ціхую» іх гадзіну мыюць падлогу — каб блішчэла чысцінёй і сонечнымі зайчыкамі?

Вельмі важна правільна, справядліва ацаніць уклад кожнага атрада, кожнага байца. І таму мы звяртаемся да вас, юнакі і дзяўчаты, да вашых думак і меркаванняў. Ісціна нараджаецца дзякуючы агульным намаганням.

Шмат пытанняў паўстае і тады, калі размова заходзіць аб унутрывузаўскім будаўніцтве. Як называць студэнцкія атрады, што заняты на іх? Атрады бясплатнай працы ці бязвыплатнай?

Некаторыя лічаць, што і тут сутнасць не ў назве атрада, а ў тым, што яны бескарысліва працуюць на даверaным участку. Зрэшты, гэта амаль так. Але... давайце прыгадаем усё ж, што атрад бязвыплатнай працы аб'ядноўвае людзей, якія кіруюцца высакароднай ідэяй і аддаюць заробленыя грошы свядома. Падрыхтоўчы перыяд іх — праца свядомасці, патрыятычных пачуццяў. Не магу сцвярджаць, што іменна такія ж стымулы заўсёды прыводзяць юнакоў і дзяўчат у ЛСА, якія працуюць на добраўпарадкаванні роднай альма матэр. А значыць, і грамадская ацэнка іх працы павінна быць рознай. Якое ваша меркаванне?

Прадбачу шмат пытанняў і наконт «законнасці» (ці незаконнасці?) патрабаванняў прывілей байцоў АБП. У той час, як іх аднакурснікі зарабілі за час працоўнага семестра не па адной сотні рублёў, яны — ад грошай адмовіліся. Хоць летні «давесак» да стыпендыі ніколі не бывае лішнім. Дык ці можна мець надзею, што ў будучым удзел у АБП будзе ўлічаны? Асабіста маё меркаванне — не. Бо спекуляваць высакароднай ідэяй атрада бязвыплатнай працы больш чым непрыстойна.

Колькі працаваць АБП: адзін ці два летнія месяцы? А магчыма, ёсць сэнс уводзіць у звычайныя атрады брыгады бязвыплатнай працы, выкарыстоўваючы вопыт пскоўскіх камсамольцаў? Ці абавязкова кожнай навучальнай установе штогод фарміраваць АБП? Жаданне ў што б там ні было не страціць прэстыжнасць часам прыводзіць да паспешлівага фарміравання атрадаў бязвыплатнай працы. І як ад такіх атрадаў патрабаваць шчырай адданасці справе?

Якой, нарэшце, вы бачыце падзяку байцам АБП за іх працу?

ШМАТ ПЫТАННЯЎ. І, пэўна, розныя адказы, з улікам канкрэтных сітуацый, могуць быць на іх. І нам трэба ўлічыць усе, каб добрая справа, якую распачалі атрады бязвыплатнай працы, набірала сілы, натхняла аптымізмам і верай.

Л. ГАЛЮТА,
камісар рэспубліканскага
студэнцкага атрада




ПІСЬМЫ З ЛЕТА

## Падарунак

ШМАТ добрых спраў на рахунку студэнцкага будаўнічага атрада «Рытм» Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пяты год запар будучыя юрысты працуюць у калгасе «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна. Рукамі юнакоў тут пабудавана вуліца з прыгожых катэджаў. Назву далі ёй вяскоўцы — «Універсітэцкая». А яшчэ хлопцы з «Рытма» правялі рэканструкцыю трох цялятнікаў, пабудавалі свінарнік, майстэрні для механізатараў. З фантазіяй афармілі пакоі жывёлаводаў, дом пасечніка, шчыравалі і на многіх іншых аб'ектах. А ў вольны ад работы час на тэрыторыі дзіцячага сада байцы атрада стварылі гарадок, поўны казачных цудаў.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
камандзір Клецкага занальнага штаба СБА.

СПЫНІСЯ, ІМГНЕННЕ! — ДЗЯВОЧЫ ПОЗІРК



*ХТО МОЖА ПАХВАЛІЦЦА, ШТО АТРЫМАЎ У ПАДАРУНАК АД МІНУЛАГА ЛЕТА ТАКІ ПОЗІРК? ТОЙ, ХТО «ЗГАРЭЎ» НА ЧАРНАМОРСКІМ УЗБЯРЭЖЖЫ? ЦІ МОЖА ТОЙ, ХТО ПРАЛАЙДАЧЫЎ УВЕСЬ ЧАС ДОМА?*

*НЕ, НЕ І НЕ! ТОЛЬКІ Ў СУМЕСНАЙ ПРАЦЫ, КАЛІ РУКІ ВАЛЯЦЦА АД СТОМЫ, А СЭРЦА РВЕЦЦА ДА СВАЁЙ АДЗІНАЙ, МОЖА ПРЫЙСЦІ ТАКОЕ ШЧАСЦЕ. ПРЫЙДЗЕ ЯНО Ў ТУЮ РЭДКУЮ МІНУТУ, КАЛІ МОЖНА ПАБЫЦЬ РАЗАМ, ПАГАВАРЫЦЬ, ПАТАНЦАВАЦЬ. ВОСЬ ЯНО — ГЭТА ІМГНЕННЕ! ЯНО АДБЫЛОСЯ НА ФЕСТЫВАЛІ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ ГОРАДА МІНСКА.*

*Фотаэцюд С. Плыткевіча.*

ПІСЬМЫ З ЛЕТА

## МАРА? «МАРА»!

НАВАТ выпадковыя прахожыя не маглі заставацца абыякавымі да гэтай усеагульнай весялосці: старэйшыя не хавалі добрых усмешак, гледзячы на дзяўчат у будатрадаўскай форме, маладзейшыя зайздросцілі ім. Звінела гітара, гучалі апошнія песні, чуліся апошнія пажаданні. Дзяўчаты са студэнцкага будаўнічага атрада «Мара» філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна — «мараўкі» — развітваліся са сваімі сябрамі, абменьваліся адрасамі.

Штогод прыходзяць праводзіць атрад байцы мінулых гадоў. Многія з іх сёння працуюць настаўнікамі, займаюцца ў аспірантуры, але сувязь з «Марай» не парываюць. Яшчэ раз акідваюць крытычным позіркам камандзіра і камісара — ці вартыя такіх высокіх «пасад»? Даюць апошнія парады навічкам.

Іх, «маравак», сёння сотні. Кожная дзяўчына лічыць за гонар стаць байцом «Мары». А з надыходам вясны будатрад становіцца проста-такі асноўнай тэмай размоў. Чаму?

Безумоўна, можна было б доўга расказваць пра высокі ўзровень афармлення атрадных газет — газета «Мара» прадстаўляла рэспубліканскі друк студэнцкіх будатрадаў у Маскве. Пра цікавы рытуал пасвячэння ў байцы. Пра захапляючыя праграмы агітбрыгад — калі яна выступае на сцэне, то ў зале падтрымлівае «артыстаў» увесь атрад. Пра атрадных мастакоў і дэкламатараў, музыкантаў і паэтаў...

Але не гэта самае галоўнае — зусім іншае. Калі ў цябе няма сяброў — ты знойдзеш іх тут абавязкова. Калі табе зробіцца сумна — хтосьці возьме гітару ў рукі і ў тваёй душы зноў вырастуць крылы. Калі ты штонебудзь умееш, то «Мара» прымусіць раскрыць усе здольнасці. Адным словам, калі трапіш у будатрад — збудуцца, хоць і не ўсе, але многія твае юначыя мары...

І. КРЭТОВІЧ,
сакратар камітэта камсамола
філалагічнага факультэта.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

31 жніўня 1986 г.

АТ 07460. Зак. 1105.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4 ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.